Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

13 красавіка 2015 года, № 6 (2130)

ПАДЗЕЯ

# Першы крок у дзівосную краіну ведаў!

**Традыцыйны фестываль факультэтаў БДУ** сабраў 28 сакавіка сотні выкладчыкаў, студэнтаў, абітурыентаў і іх бацькоў на адмысловым свяце для будучых «птушанят» альма-матар.



Фота Ганны ЗАНКОВІЧ






*Яркі фестываль факультэтаў застанецца на доўга ў памяці юных абітурыентаў і ўсіх гасцей БДУ*

Нягледзячы на не зусім спрыяльнае надвор'е, панавала сапраўды святочная атмасфера. Гасцей сустракалі вясёлыя роставыя лялькі і хадулісты, паўсюль была чутная музыка і смех, туды-сюды хадзілі студэнты ў мудрагелістых строях, павольна прагульваліся здзіўленыя маштабнасцю фестывалю старшакласнікі. Ля будынка ліцэя размясціліся палаткі савета па якасці адукацыі, пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі БДУ і пярвічкі БРСМ, а моладзевыя актывісты гатовыя былі распавесці ўсім ахвотнікам пра сваю дзейнасць. А на вулічнай сцэне выступалі найлепшыя артысты БДУ.

У сценах ліцэя былі размешчаны стэнды медыяцэнтра, прыёмнай камісіі і фундаментальнай бібліятэкі БДУ, прадстаўнікі якіх раздавалі карысныя брашуры і ўлёткі і адказвалі на пытанні абітурыентаў, якія іх абкружылі, а супрацоўнікі псіхалагічнай службы прапаноўвалі ахвотнікам прайсці цікавыя тэсты і даведацца шмат новага пра сябе. У актавай зале пад выбухі смеху і апладысментаў студэнты дэманстравалі візітоўкі факультэтаў – юнакі і юначкі жартавалі, спявалі, танчылі – увогуле, спрабавалі прыцягнуць свежыя розумы на свой факультэт.

Але сапраўдныя баталіі за абітурыентаў разгарнуліся ва ўнутраным дворыку. Мноства маляўнічых шатроў размясцілі пад сваімі дахамі ўсе факультэты і інстытуты БДУ. Студэнты імкнуліся не толькі на словах распавесці пра вучобу на сваіх факультэтах, але і прадэманстраваць набытыя навыкі і веды. Напрыклад, фізікі эксперыментальна даказалі дзеянне некаторых законаў прыроды і прапанавалі ўсім ахвотнікам выпрабаваць іх на сабе. Ваенны факультэт прадэманстраваў навучальную зброю, а студэнты наўпрост на месцы вучыліся разбіраць і збіраць яе, будучыя гісторыкі прапаноўвалі паўдзельнічаць у касцюмаваных бітвах, кафедра фізвыхавання і спорту забаўляла абітурыентаў бляскам заваяваных кубкаў і медалёў, а таксама трэнажораў, хімікі змешвалі штосьці рознакаляровае ў мностве колбачак, будучыя эканамісты прапаноўвалі сфатаграфавацца на вокладку Forbes, а студэнты біяфака здзіўлялі ўсіх, дэманструючы экзатычных насякомых і разглыдваючы са змяёй на шыі. Увесь час былі чутны вабныя заклікі: «Дзяўчаты, паступайце на факультэт радыёфізікі! Разам з дыпломам муж у падарунак».

Асабліва гаманліва было ля палаткі студэнцкага прафсаюза, якая была ператворана ў прыстанак усёведнага аракула, якога знадворку ахоўвалі феі-сек'юрыці. Акрамя таго, эльф-завадатар раздаваў мыльныя бурбалкі, што нясуць радасць і пазітыў; пара са старажытнасці – мужны рыцар з чароўнай дамай, якая ілюстравала знак прафкама – шчыт, што сімвалізуе абарону правоў і інтарэсаў студэнтаў. Таксама ўсіх гасцей мерапрыемства запрашалі зрабіць фота няўрымслівыя конь і цмок. Прайсці міма было проста немагчыма – гэтулькі персанажаў і фарбаў даўно не спалучаліся ў адным месцы ў адзін час. Такі яркі «карнавал», напэўна, застанецца надоўга ў памяці юных абітурыентаў і ўсіх гасцей БДУ!

Пацешыў фестываль факультэтаў і наватвядзеннямі. Сёлета ўпершыню праводзілася анлайн-трансляцыя прэс-канферэнцыі рэктара акадэміка Сяргея Абламейкі і прадстаўнікоў прыёмнай камісіі, на якой абітурыенты і іх бацькі змаглі задаць любыя пытанні. Таксама рэктар адказаў на запыты, пакінутыя ў сацыяльнай сетцы «УКантакце». Было паднята мноства актуальных тэм, якія тычацца ўступнай кампаніі, даўніверсітэцкай падрыхтоўкі, жыцця факультэтаў, а таксама наяўнасці месцаў у інтэрнатах. Відэа з прэс-канферэнцыі вы можаце паглядзець на сайце газеты «Універсітэт» і на канале БДУ па адрасе *www.youtube.com/user/videoBSU*. Сяргей Абламейка заклікаў абітурыентаў паспяхова здаваць ЦТ і не баяцца падаваць дакументы ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – найлепшую ўстанову вышэйшай адукацыі.

**Дар'я КОЎЗА**
**Дар'я АРЦЁМЕНКА**

## Чытайце ў нумары:


**ЗНАК ПАШАНЫ ЗА ПРАЦОЎНАЕ ПРАВА**
Нарыс пра першага пасляваеннага дырэктара Мінскага юрыдычнага інстытута і прарэктара БДУ Гаўрыла ПАВЕЦЬЕВА
Стар. 2

**МАТЫВАТАР АДОРАНАЙ МОЛАДЗІ**
Дацэнт геафака Дзмітрый КУРЛОВІЧ прызнаны найлепшым арганізатарам НДР студэнтаў і аспірантаў БДУ
Стар. 3

**ЖАРСЦІ І КАРОНА**
Доўгачаканы конкурс «Міс БДУ» абвясціў новую каралеву прыгажосці
Стар. 4


## Весткі з рэктарата

ДЫПЛОМЫ доктара навук і атэстаты прафесара ўручыў навуковым і навукова-педагагічным работнікам Прэзідэнт Беларусі. Сярод іх і навукоўцы БДУ. Дыпломы доктара навук атрымалі: прафесары фізічнага факультэта *Рыгор Марціновіч* (кафедра біяфізікі) і *Андрэй Навіцкі* (кафедра тэарэтычнай фізікі і астрафізікі). Атэстат прафесара па спецыяльнасці «геаграфія» ўручаны загадчыку НДЛ возеразнаўства *Барысу Уласаву,* а атэстат прафесара па спецыяльнасці «сацыялогія» – дэкану факультэта філасофіі і сацыяльных навук *Анатолю Рубанаву.*

* * *

ПРЭЗІДЫУМ НАН Беларусі высока ацаніў унёсак навукоўцаў БДУ ў даследаванні базона Хігса. У пастанове гэтага органа адзначана, што суаўтарамі публікацый пра адкрыццё новай часціцы з'яўляецца 21 супрацоўнік навуковых арганізацый Беларусі, сярод іх 15 з БДУ. Гэта спецыялісты ННВЦ фізікі часціц і высокіх энергій Ігар Емяльянчык, Аляксандр Літомін, Уладзімір Макаранка, Уладзімір Мосалаў, Аляксандр Солін, Павел Старавойтаў, Раман Стэфановіч, Хуан Гільерма Суарэс Ганзалес, Уладзімір Чахоўскі, Мікалай Шумейка, Сяргей Януш, а таксама супрацоўнікі Навукова-даследчага інстытута ядзерных праблем БДУ Раман Зуеўскі, Міхаіл Коржык, Алег Місевіч, Андрэй Фёдараў.

* * *

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ прадстаўніка Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Беларусі Жана Іва Бушардзі для журналістаў рэспубліканскіх СМІ адбылася 2 красавіка на факультэце міжнародных адносін. У абмеркаванні сітуацыі прынялі ўдзел таксама прадстаўнікі Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС нашай краіны. Арганізавала брыфінг міжнароднае грамадскае аб'яднанне па навукова-даследчых і інфармацыйна-адукацыйных праграмах «Развіццё».

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

НАША СПАДЧЫНА

# Знак Пашаны за працоўнае права

**Пра пасляваеннага дырэктара Мінскага юрыдычнага інстытута і пазней прарэктара БДУ, распачынальніка беларускага працоўнага права Гаўрыіла ПАВЕЦЬЕВА.**

Нарадзіўся Гаўрыіл Аляксеевіч 6 красавіка 1909 г. у Самарскай губерні. Рана асірацеў: бацька загінуў падчас Першай Сусветнай вайны, а маці – у галодныя 1920-я гады. Малалетні Гаўрыіл разам са старэйшай сястрой да таго, як патрапіць у дзіцячы дом, сам шукаў сабе пражытак, ходзячы па вёсках і згаджаючыся на любую працу. У 1930 г. адразу з прытулку з'язджае вучыцца ў Ленінград і паступае ў Ваенна-марское вучылішча імя Фрунзэ, каб служыць, як і яго бацька, на флоце. Але неўзабаве разумее, што яму гэта не цікава, і паступае ў знакаміты Ленінградскі інстытут савецкага права імя М. В. Крыленкі на судова-пракурорска-следчае аддзяленне. У 1933 г., пасля выпуску, яго адпраўляюць на пракурорскую працу ў Туркменскую ССР.

А праз шэсць месяцаў Гаўрыіла Аляксеевіча заклікаюць у Чырвоную армію, і служыць ён у батальёне сувязі ад Ташкента да Кушкі на мяжы з Афганістанам. Пасля дэмабілізацыі (1934) Павецьеў вяртаецца ў горад на Няве і зноў звязвае жыццё з родным інстытутам. Ён становіцца аспірантам у прафесара Васіля Дагадава – заснавальніка ленінградскай школы працоўнага права.

Зарэкамендаваўшы сябе за час вучобы, Гаўрыіл Аляксеевіч застаецца ў інстытуце выкладаць працоўнае права (дарос да дацэнта), адначасова працуючы памочнікам загадчыка навучальнай часткі.

У гэты час у Павецьева з'яўляецца і сям'я: жонка Ганна Аляксандраўна і два сыны – Ярад і Валерый. Але неўзабаве пачалася вайна. Сям'я Павецьева паспела выехаць на радзіму жонкі ў Майкоп, а сам Гаўрыіл Аляксеевіч застаўся ў Ленінградзе і перажыў там усе жахі першага перыяду 900-дзённай блакады, служачы на кіраўнічых пасадах у сістэме ваенных трыбуналаў Чырвонай арміі. Пасля прарыву блакады (1943) яго пераводзяць у Маскву ў кіраванне ваенных трыбуналаў войскаў НКУС Народнага камісарыята юстыцыі СССР. За ваенную дзейнасць Гаўрыіл Аляксеевіч быў узнагароджаны баявым ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны першай ступені і двума медалямі.



*Г. А. Павецьеў разам з рэктарам БДУ А. Н. Сеўчанкам*



*Г. А. Павецьеў на XVII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Ёрку. 1967 год*

Пасля вайны Г. А. Павецьева накіроўваюць у Беларусь і 4 лістапада 1945 г. прызначаюць дырэктарам Мінскага юрыдычнага інстытута. З улікам яго ваеннага досведу і аўтарытэту ва ўладных структурах атрымалася пабудаваць і адрамантаваць памяшканні для навучання і пражывання студэнтаў, забяспечыць аўдыторыі мэбляй, здабыць неабходны транспарт.

Вялізную дапамогу ў аднаўленні аказвалі ўстановы РСФСР, з якімі Павецьеў падтрымліваў цесную сувязь. У МЮІ паступала не толькі фінансавая дапамога. Напрыклад, ленінградскі юрыдычны інстытут падарыў 10 тыс. кніг для бібліятэкі.

Акрамя гаспадарчых праблем Гаўрыіл Аляксеевіч аднаўляў навучальную і навуковую дзейнасць інстытута з дапамогай кадраў «ленінградскай школы»: У. А. Дарогін, І. А. Гарэлік, А. В. Дулаў, В. А. Шкурко, В. М. Шпілёў. Такім чынам, калі ў 1944/45 навуч. г. было ўсяго 3 выкладчыкі, то ў 1947/48 навуч. г. ужо 14 кандыдатаў навук, з іх 8 дацэнтаў і 6 выкладчыкаў.

Галоўным дасягненнем Павецьева стала падрыхтоўка аспірантаў – новага пакалення юрыстаў. З 1946 г. першымі аспірантамі сталі: І. С. Цішкевіч, С. Г. Драбязка, П. К. Еўдакімаў, Н. А. Кудзінаў, І. І. Марціновіч, В. Ф. Чыгір, С. Р. Віхараў, С. П. Бекешка, В. А. Матусевіч, М. Р. Юркевіч, Ю. П. Смірноў, Н. М. Пятроў, Д. Ф. Нагатоў, П. М. Марыкаў, якія пасля вызначылі сённяшняе аблічча беларускай юрыспрудэнцыі.

Павецьеў увесь час падштурхоўваў сваіх маладых навукоўцаў да напружанай працы і імкнуўся ствараць для гэтага разнастайныя ў той складаны час умовы. Як кіраўнік, паказваў, як трэба дамагацца мэты. Ён хутка завяршыў пачатае да вайны даследаванне на тэму «Прававое рэгуляванне падрыхтоўкі кваліфікаваных працоўных кадраў для сацыялістычнай прамысловасці» і ў 1948 г. першым з юрыстаў усіх спецыяльнасцяў у пасляваеннай Беларусі дасягнуў кандыдацкай вяршыні. Адначасова ён стаў другім (пасля Э. В. Зайчыка) кандыдатам юрыдычных навук у гісторыі беларускага працоўнага права.

У 1954 г. пасля рэарганізацыі МЮІ ў юрыдычны факультэт БДУ, Гаўрыіла Аляксеевіча прызначаюць прарэктарам па навуковай працы ўсяго Белдзяржуніверсітэта. На гэтай пасадзе ён працаваў 8 гадоў, а пакінуў яе па асабістай просьбе з намерам завяршыць доктарскую дысертацыю.

Гаўрыіл Аляксеевіч чытаў працоўнае права 25 гадоў (1946–1971). Як навуковы кіраўнік, ён падрыхтаваў трэцяга і чацвёртага ў беларускай гісторыі кандыдатаў навук па працоўным праве: Ю. П. Смірнова і Л. Я. Астроўскага. Пасля яны прымалі ўдзел у кадыфікацыі працоўнага заканадаўства ўжо суверэннай Беларусі.

Гаўрыіл Аляксеевіч з'яўляўся членам навукова-метадычнага савета пры Вярхоўным судзе і метадычнага савета пры Пракуратуры БССР. Быў членам урадавай камісіі па кадыфікацыі заканадаўства БССР і членам рэспубліканскага камітэта прафсаюза супрацоўнікаў школ, ВНУ і навуковых устаноў.

Ён пачаў асвятляць гісторыю савецка-беларускага працоўнага права як галіну, што знайшло адлюстраванне ў пяці спецыяльных падраздзелах «Працоўнае права» ў двух выпусках калектыўнай манаграфіі навукоўцаў БДУ (1958, 1969). Пад кіраўніцтвам Г. А. Павецьева і Ф. І. Гаўзэ выйшаў зборнік артыкулаў «Пытанні савецкага грамадзянскага і працоўнага права». Усяго Павецьеў апублікаваў звыш 25 навуковых прац.

Ён пакінуў след і ў стварэнні нормаў міжнароднага права, беручы ўдзел у складзе дэлегацый БССР у працы (VII, VIII, XVII) сесій Генеральнай Асамблеі, 1-й і 2-й канферэнцый ААН па марскім праве, якія праходзілі у Нью-Ёрку і Жэневе.

За вялікія заслугі ў падрыхтоўцы спецыялістаў і развіцці навукі Гаўрыіл Павецьеў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўнае адрозненне» і «За доблесную працу». Ён адзначаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Спецыяльнай камісіяй пры Савеце міністраў яму ўстаноўлена персанальная пенсія рэспубліканскага значэння.

Такім чынам, Гаўрыіл Аляксеевіч быў распачынальнікам беларускага працоўнага права а таксама галоўным арганізатарам аднаўлення юрыдычнай і іншых навук у сістэме БДУ.

Памёр Г. А. Павецьеў у 1971 г. на 62 годзе жыцця ад раку страўніка, які, паводле ўрачоў, развіўся ад голаду ў блакадным Ленінградзе.

**Віктар КРЫВОЙ,**
**доктар юрыдычных навук**
**Дар'я ПРЫГОДЗІЧ,**
**супрацоўнік Музея гісторыі БДУ**

АСОБЫ

# Універсітэцкі фатограф бачыў многае

**Сваім вобразам БДУ шмат у чым абавязаны фатографу Генадзю КРАСКОЎСКАМУ, які на працягу 50 гадоў здымае выкладчыкаў, студэнтаў і навукоўцаў альма-матар.**

Аднак сам Генадзь Аляксандравіч, хоць ён бывае амаль на ўсіх мерапрыемствах, заўсёды застаецца за кадрам. Рэдакцыя газеты «Універсітэт» нарэшце вырашыла зняць на камеру таго, хто здымае іншых, і распытаць яго пра адданасць прафесіі.

У кабінеце Генадзь Аляксандравіч сядзіць вельмі рэдка. Часцей ён бярэ свайго вернага сябра, фотаапарат, і адпраўляецца на здымкі па просьбе супрацоўнікаў на розныя факультэты. Камусьці патрэбна стварыць дыдактычны матэрыял, хтосьці запрашае на дзень нараджэння кафедры, іншыя адзначаюць свята, а некаторыя праводзяць канферэнцыю. Бываюць дні, калі Генадзь Краскоўскі пераходзіць з аднаго мерапрыемства на другое, не маючы часу на адпачынак, і гэта ў яго сталым узросце. Ніхто лепш за яго не ведае, наколькі багатае на падзеі жыццё ўніверсітэта.

На здымках Генадзя Аляксандравіча не пазначана, што яны зроблены менавіта ім. Па яго словах, ён зусім абыякавы да славы.




Фота Ганны ЗАНКОВІЧ

І толькі хоча, каб яго праца была заўважана людзьмі.

Тое ж самае тычыцца і гістарычных падзей, якіх Генадзь Аляксандравіч адлюстраваў багата. У яго фотаархіве знойдуцца выявы ажно васьмі рэктараў, за дзейнасцю якіх ён сачыў па «абавязку службы», асаблівае месца ў гісторыі БДУ займаюць фотаздымкі Пятра Машэрава падчас яго наведвання нашага ўніверсітэта, візіты Міхаіла Гарбачова, Аляксандра Лукашэнкі і шматлікіх прэзідэнтаў і высокіх гасцей іншых краін. Ён прысутнічаў пры падпісанні першых дамоў аб супрацоўніцтве БДУ з МДУ рэктарамі Фёдарам Капуцкім і Віктарам Садоўнічым, з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, пры ўшанаваннях многіх ганаровых прафесараў, пры сустрэчах з нобелеўскімі лаўрэатамі, касманаўтамі і пры іншых неардынарных падзеях.

Генадзь Краскоўскі патрапіў у БДУ, калі ў далёкія 60-я гады паступіў на вячэрняе аддзяленне факультэта радыёфізікі і стаў лабарантам праблемнай лабараторыі паўправаднікоў фізфака, якой загадваў Валянцін Ткачоў. Але атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі з пэўных прычын яму не ўдалося. У 1967 г., калі з'явілася кафедра паўправаднікоў, Генадзь Аляксандравіч уладкаваўся туды тэхнікам і займаўся апрацоўкай розных крышталяў для навуковых эксперыментаў. Адначасова ён рэгулярна фатаграфаваў для вучэбных патрэб усяго факультэта і нават зняў кінасюжэт пра будатрадаўскі рух для агульнага фільма пра БДУ.

З 1971 г. пасля службы ў арміі ён пэўны час прапрацаваў у толькі створаным НДІ ПФП, а ў 1975 г. разам з Давідам Прэсам арганізаваў агульнаўніверсітэцкую фоталабараторыю. З таго часу Генадзь Краскоўскі і засяродзіўся на сваёй любімай справе – фатаграфаванні. У 1978 г. ён стаў загадчыкам фоталабараторыі, кім і з'яўляўся да нядаўняга часу. «На той час фоталабараторыя была даволі вялікай, – расказвае Генадзь Краскоўскі. – Пад маім кіраўніцтвам працавала 12 фоталабарантаў і кінамеханікаў, якія абслугоўвалі ўсе падраздзяленні ўніверсітэта. Яна была створана з не зусім творчай мэтай. У нашу задачу ўваходзіла забеспячэнне навучальнага працэсу. Нашы фотаздымкі і слайды часта служылі наглядным дапаможнікам да практычных і лабараторных заняткаў студэнтаў».

Фатаграфіі Генадзя Аляксандравіча былі выкарыстаны для выпуску розных буклетаў, фотаальбомаў і плакатаў. Ён, асабліва ў маладосці, пасылаў фотапрацы на розныя рэспубліканскія і міжнародныя конкурсы і нават выйграваў іх. Аднак часцей ён проста выконвае свае штодзённыя абавязкі, фіксуючы ўсе важныя для ўніверсітэта падзеі і ствараючы памяць пра яго асоб.

Нядаўна ён фатаграфаваў супрацоўнікаў і студэнтаў на дошку гонару. Для яго гэта адказная справа. Людзей, якія заслугоўваюць пашаны, трэба было прадставіць у найбольш выгадным святле. А для гэтага прыйшлося заклікаць на дапамогу ўсё ўласнае прафесійнае майстэрства. І, як вынік, уганараваныя БДУ асобы прыцягваюць увагу ўсіх, хто праходзіць каля стэнда.

Фатаграфанне стала яго жыццём. І ўжо не мае сэнсу разважаць, наколькі выпадковым гэта было. Галоўнае, што яго жаданне здымаць людзей і з'явы прынесла плён.

**Ганна ЛАГУН**

*Цалкам матэрыял чытайце на сайце www.gazeta.bsu.by*




Фота Аляксандра СНАПКА

# Прафсаюз даў справаздачу

У рамках справаздачна-выбарнай кампаніі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2–3 красавіка адбыўся VIII з’езд Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.

На з’езд прыбылі 250 дэлегатаў ад абласных, раённых і гарадскіх прафсаюзных арганізацый. БДУ прадстаўлялі міністр адукацыі Беларусі Міхаіл Жураўкоў, рэктар Сяргей Абламейка, старшыні пярвічных прафсаюзных арганізацый работнікаў і студэнтаў Ігар Вярэнчыкаў і Вольга Локцева адпаведна, а таксама члены прафкамаў.

У працы з’езду ўдзельнічалі старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл Орда, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта РБ Ігар Бузоўскі, намеснік прэм’ер-міністра Наталля Качанава і іншыя дзяржаўныя дзеячы, а таксама старшыня Міжнароднага аб’яднання прафсаюзаў работнікаў адукацыі і навукі Галіна Мяркулава.

З дакладам пра працу за пяць гадоў выступіў Аляксандр Бойка, старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Ён агучыў не толькі факты, якія пацвярджаюць маштабнасць спраў і рэальнага дзейснага клопату пра членаў галіновага прафсаюза, якіх больш за 602 тысячы, але і актуальныя праблемы адукацыі.

Прафсаюз занепакоены тэндэнцыяй росту коштаў на тавары, працы і паслугі, зніжэння рэальнай заработнай платы работнікаў галіны і іх пакупніцкай здольнасці, несвоечасовага перагляду памеру тарыфнай стаўкі першага разраду, нераспаўсюджання на шэраг катэгорый педагагічных работнікаў пастановы Савета міністраў ад 23.08.2014 «Пра некаторыя пытанні павышэння аплаты працы асобным катэгорыям работнікаў сістэмы адукацыі», іншых адпаведных рашэнняў урада, а таксама выяўляе заклапочанасць зніжэннем сацыяльнай абароненасці асобных катэгорый работнікаў галіны.

Дэлегаты заслухалі справаздачу рэвізійнай камісіі. Выступілі міністр адукацыі і старшыня ФПБ і іншыя ўпаўнаважаныя асобы. Шляхам адкрытага галасавання большасцю галасоў на пасаду старшыні Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі быў абраны Бойка А. А. Таксама былі вызначаны Цэнтральны камітэт галіновага прафсаюза і дэлегаты VII з’езду ФПБ. Зацверджаны Статут БПСРАН у новай рэдакцыі і Праграма асноўных напрамкаў дзейнасці галіновага прафсаюза на 2015–2020 гг.

**Паводле інфармацыі пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ**

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**2 красавіка Скарапанава Ірына Сцяпанаўна,** прафесар кафедры рускай літаратуры

**4 красавіка Корзюк Віктар Іванавіч,** прафесар кафедры матэматычнай кібернетыкі

**5 красавіка Саўлучынскі Валерый Усеваладавіч,** вядучы спецыяліст па забеспячэнні навучальнага працэсу навучальнай лабараторыі агульнавайсковай кафедры

**9 красавіка Бурдун Аляксей Аляксандравіч,** дацэнт кафедры геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі

**13 красавіка Восіпава Людміла Аляксандраўна,** дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу

**14 красавіка Верына Ульяна Юр’еўна,** дацэнт кафедры рускай літаратуры

**16 красавіка Палоннікаў Аляксандр Андрэевіч,** намеснік начальніка ЦПРА-начальнік аддзела планавання адукацыі і рэформаў

**17 красавіка Ніфагін Уладзімір Аляксандравіч,** загадчык кафедры інфармацыйных тэхналогій

**20 красавіка Вядзернікаў Сяргей Васільевіч,** дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі

**23 красавіка Егарэйчанка Аляксандр Андрэевіч,** загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін

**24 красавіка Кузьміч Наталля Васільеўна,** дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі

**24 красавіка Патапава Вольга Васільеўна,** дацэнт кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства

**28 красавіка Саніковіч Валянціна Аляксандраўна,** дацэнт кафедры рускай мовы

**28 красавіка Мілава Таццяна Францаўна,** дырэктар ДУА «Інстытут бесперапыннай адукацыі» БДУ

**30 красавіка Ванькевіч Аляксандр Ігнацьевіч,** дацэнт кафедры інавацыйнага менеджменту

## НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

# Матыватар адоранай моладзі

**Дацэнт геаграфічнага факультэта Дзмітрый КУРЛОВІЧ** нядаўна стаў пераможцам конкурсу «Найлепшы арганізатар НДР студэнтаў і аспірантаў БДУ».

Студэнты і аспіранты кафедры глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм і СНДЛ «ГІС-лабараторыя» пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Курловіча з 2012 па 2014 гг. удзельнічалі ў выкананні 13 даследчых работ, зрабілі 165 дакладаў на навуковых канферэнцыях (у тым ліку 60 дакладаў на канферэнцыях міжнароднага ўзроўню), падрыхтавалі 125 навуковых публікацый (у тым ліку 1 дапаможнік, 13 артыкулаў у выданнях, якія ўключаны ў пералік ВАК, 104 артыкулы ў зборніках навуковых канферэнцый), прадставілі на конкурсы 53 навуковыя працы (дыпломамі I ступені ўзнагароджаны 10 прац, II і III ступеняў – па 9 прац), падрыхтавалі 6 актаў укаранення вынікаў НДР у вытворчасць і 2 акты – у навучальны працэс.

Дзмітрый Міраслававіч кіруе навукова-даследчай работай студэнтаў з 2008 г. і з’яўляецца кіраўніком міжкафедральнай СНДЛ «ГІС-лабараторыя», якая за сваю дзейнасць у 2013 і 2014 гг. прызнавалася «Найлепшай СНДЛ БДУ». У мінулым годзе «ГІС-лабараторыя» была рэкамендавана для заахвочвання спецыяльным фондам Прэзідэнта РБ па падтрымцы таленавітай моладзі.



Менавіта Дзмітрый Курловіч вызначае тэматыку даследаванняў студэнтаў кафедры і СНДЛ геаграфічнага факультэта, штогод складае план іх працы, ажыццяўляе кансультаванне і метадычнае кіраўніцтва даследаванняў, аказвае дапамогу ў асваенні студэнтамі і аспірантамі сучасных навуковых метадаў, сочыць за ходам і якасцю іх выканання.

Студэнцкія навуковыя працы кафедры адпавядаюць прыярытэтным кірункам даследаванняў у нашай краіне. Напрыклад, студэнты бяруцца даследаваць глебы і землі асобных рэгіёнаў Беларусі, вызначаюць геахімічныя асаблівасці ландшафтаў, праводзяць ГІС-аналіз і 3D-мадэляванне прыродных і антрапагенных ландшафтаў і іх кампанентаў, выкарыстоўваюць геаграфічныя інфармацыйныя сістэмы (ГІС) і дадзеныя дыстанцыйнага зандавання Зямлі з мэтай картаграфавання прыродных рэсурсаў, тым самым ствараючы гарадскі і зямельны кадастр. Дзмітрый Міраслававіч лічыць, што праца студэнтаў у асяродку ГІС не толькі цікавая з навуковага пункта погляду, але яе можна прымяніць і ў любой іншай галіне. Транспарт, лагістыка, маніторынг надзвычайных сітуацый – усюды запатрабаваны геаграфічныя інфармацыйныя сістэмы.

Дзмітрый Курловіч у свой час стаў ініцыятарам правядзення конкурсаў геаграфічных інфармацыйных праектаў студэнтаў і аспірантаў усіх устаноў вышэйшай адукацыі нашай краіны, якія праходзяць у БДУ звычайна ў рамках штогадовага міжнароднага дня ГІС. Дзмітрый Міраслававіч каардынуе працу рэдакцыйнай камісіі зборніка матэрыялаў студэнтаў і аспірантаў, якія ўдзельнічалі ў гэтым мерапрыемстве, а таксама рыхтуе іх для электроннай бібліятэкі БДУ. Гэтую яго дзейнасць кіраўніцтва геаграфічнага факультэта расцэньвае як новую форму арганізацыі і стымулявання навукова-даследчай работы студэнтаў. У мінулым годзе Дзмітрый Курловіч выступіў на рэспубліканскім семінары-нарадзе з дакладам «Арганізацыя працы з адоранай моладдзю». Адоранай моладдзю ён якраз і лічыць студэнтаў, з якімі ў сувязі са сваёй выкладчыцкай дзейнасцю сустракаецца кожны дзень.

**Ганна ЛАГУН**

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага мадэлявання і кіравання, арганічнай хіміі,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: біяфізікі, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, культуралогіі,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, мытнай справы, экалогіі чалавека, менеджменту і эканомікі сацыяльнай сферы, інфармацыйных тэхналогій,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: вылічальнай матэматыкі, камп’ютарных тэхналогій і сістэм, тэхналогій праграмавання, фізічнай электронікі і нанатэхналогій, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, дызайну, агульнай і клінічнай псіхалогіі,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, дызайну,

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, вылічальнай матэматыкі, матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб’явы. Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Прэс-канферэнцыя рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі для прадстаўнікоў рэспубліканскіх СМІ** – megacat.by (23.03), БелТА, Minsknews.by, Tut.by, onliner.by, СТБ, Радыё «Сталіца», 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё, АНТ, Мінск 24 ДОК, БелаПАН, reporter.by euroradio.fm, kudapostupat.by, kv.by, interfax.by (24.03).

**Пра назіранне за частковым сонечным зацьменнем у БДУ** – Tut.by (03.03), «Рэспубліка» (06.03), sb.by (09.03), kv.by, interfax.by, mail.ru, БелаПАН, map.by (19.03), minsknews.by, АНТ, Мінск 24 ДОК, gazetaby.com, БелаПАН, nn.by, zviazda.by, БелТА (20.03), «СБ-Беларусь сёння» (21.03).

**Прэзентацыя Збору твораў Івана Шамякіна ў 23 тамах прайшла на філалагічным факультэце БДУ** – БелТА, csl.bas-net.by, radiobelarus.tvr.by (05.03), nlb.by (09.03).

**Грамадска-асветніцкая акцыя «Універсітэт – твой крок у будучыню–2015»** – megacat.by (08.03), БТ-1, Мінск 24 ДОК (12.03).

**Пра фотапраект «Сонечная прафесія», арганізаваны ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю БДУ** – БелТА, 21.by, naviny.by (11.03), mamochki.by, «Звязда», Zvyazda.by (12.03).

**У БДУ прайшоў конкурс сярод замежных студэнтаў «Містар International»** – БелаПАН, Tut.by, БТ-1, Мінск 24 ДОК, АНТ (20.03), БелТА, 21.by, «Звязда», Zvyazda.by (23.03).

**Фестываль факультэтаў БДУ** – kudapostupat.by, Abiturient.by, zviazda.by (20.03), 21.by, БелТА, megacat.by (24.03), АНТ, БТ-1 (28.03).

**У БДУ дадзены старт новаму праекту «Навука на пальцах»** – 21.by, naviny.by, kv.by (23.03).

**Дзень кар’еры ў БДУ** – zviazda.by, «Звязда» (21.03) 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё, радыё «Сталіца» (24.03), Мінск 24 ДОК, АНТ (25.03).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**



Фота Аляксандра СНАПКА

# Жарсці і карона

50 прэтэндэнтак, 20 фіналістак, 16 экспертаў, 18 партнёраў імпрэзы, 1 месяц падрыхтоўкі, 3 дэфіле, 320 прымерак і нават 2 непрытомнасці, але толькі адна пераможніца – усё гэта **грандыёзны конкурс прыгажосці «Міс БДУ–2015».**

Увечар 2 красавіка ў канцэртнай зале Prime Hall сабраліся ўсе знаўцы прыгажосці і элегантнасці, каб даведацца, хто ж заслужыць тытул самай прыгожай студэнткі БДУ. У холе ўсім ахвотнікам прапанавалі абраць «Міс глядацкіх сімпатый». Госці знемагалі ў чаканні пачатку конкурсу, не змаўкалі спрэчкі, хто ж атрымае запаветную карону пераможніцы. А мужчыны жартавалі пра вечную «пунктуальнасць» дам. І, нарэшце, шоу пачалося.

Задаў тон танцавальны калектыў TREND DELUXE. Вядучыя Канстанцін Прыдыбайла і Аляксей Барэйша прадставілі журы. Экспертамі былі выключна мужчыны – супрацоўнікі ўніверсітэта і партнёры мерапрыемства.

Нарэшце перад гледачамі з'явіліся прэтэндэнткі на званне «Міс БДУ–2015». Дзяўчаты прадэфілявалі ў чароўных кактэйльных сукенках. Гледачы сустрэлі іх апладысментамі. У многіх былі свае групы падтрымкі, якія ўсяляк падбадзёрвалі канкурсантак. Калі дзяўчаты адправіліся за кулісы для падрыхтоўкі наступнага выхаду, гледачам не давалі нудзіцца спевакі Ян Маерс і Ягор Волчак.

Падчас наступнага дэфіле дзяўчаты паўсталі ў далікатных вобразах нявест. У гэтым жа ўборы яны распавялі пра свае мары ў рамках інтэлектуальнага конкурсу і адказалі на падступныя пытанні вядучых. Дзяўчаты марылі пра рознае: як пра сямейнае шчасце і хатку ля мора, так і пра такія незвычайныя рэчы, як вывучэнне самурайскай тэхнікі бою з халодным мячом, палёт у космас і нават вандраванне ў часе. Здзівілі дзяўчаты не толькі арыгінальнымі марамі, але і формай іх прэзентацыі: Яна Петрачэнка загаварыла вершамі, а Юлія Гулько павітала прысутных на трох мовах, а аповед свой працягнула па-беларуску.

У перапынку паміж выхадамі ўдзельніц на сцэну выступілі артысты Дзмітрый Ніканові з прэм'ерай песні «Ключы» і Антон Мартынаў, а таксама спявак Alen Hit.

Як трапна заўважыў вядучы, самым чаканым выхадам дзяўчат стала дэфіле ў купальніках. Аднак, да прыкрасці шматлікіх мужчын, канкурсанткі таямніча затуляліся лятучай тканінай. Але, нягледзячы на гэту перашкоду, можна было ацаніць выдатныя постаці ўсіх удзельніц.

Пакуль сябры журы і ўсе прысутныя ачуньвалі пасля выхаду канкурсантак у купальніках, на сцэне выканалі некалькі кампазіцый Аляксей Грос і Дзмітрый Камінскі.

Завяршальным выступленнем дзяўчат было шыкоўнае дэфіле ў вячэрніх строях. Пасля гэтага пачалося хвалявальнае ўзнагароджанне ўдзельніц.

Адзін з членаў журы Міхаіл Гаўрыльчык прызнаўся нам: «Выбар пераможніцы быў вельмі няпростым, сярод суддзяў вяліся сапраўдныя баталіі. Галоўным крытэрыем выбару пераможніц была знешнасць дзяўчат. Магчыма, для аб'ектыўнай ацэнкі троху не хапіла конкурсу талентаў, але ў цэлым шоу было вельмі цікавым і пазітыўным».

Спонсары мерапрыемства ўручылі падарункі ўсім дзяўчатам. Яны таксама абралі ўласных фаварытак і ўзнагародзілі іх адмысловымі прызамі. «Міс NAVY» стала *Валерыя Казлова,* «Міс сімпатыя NAVY» – *Дар'я Валкавец,* абедзве – студэнткі Інстытута журналістыкі. Адмысловы прыз ад кампаніі Daroo атрымала *Надзея Рымаровіч.* «Міс стыль», па меркаванні кампаніі «Вайлдберыз», стала *Ганна Міхальцова.* «Міс Крыніца» была названа *Яна Петрачэнка,* якая таксама перамагла ў намінацыі «Міс фота». А адмысловым галасаваннем на сайце relax.by абралі «Міс інтэрнэт» – *Кацярыну Кам'янаву.* «Міс глядацкіх сімпатый» была прызнана *Лізавета Доўгая.* У галоўных намінацыях: трэцякурсніца ФМА ***Вольга Цвірбут*** стала другой віцэ-міс, а студэнтка чацвёртага курса журфака ***Валерыя Казлова*** – першай віцэ-міс.

Раскрыць галоўную інтрыгу вечара даручылі Міхаілу Гаўрыльчыку (прадстаўнік галоўнага спонсара – турфірмы «Элдыві») і рэктару БДУ Сяргею Абламейку. Кіраўнік універсітэта адзначыў, што ўсе ўдзельніцы прадэманстравалі спалучэнне прыгажосці і розуму і кожная вартая перамогі.

Запаветную карону пераможніцы і ганаровае званне «Міс БДУ» атрымала студэнтка трэцяга курса ФПМІ **Яна Петрачэнка.** Круіз па Балтыйскім моры на чацвярых чалавек стаў галоўным прызам.

Пераможінца падзялілася з намі пачуццём ад поспеху:

– Самым складаным для ўсіх фіналістак конкурсу, вядома ж, былі штодзённыя 3-гадзінныя рэпетыцыі на працягу двух тыдняў перад конкурсам. Зноў і зноў адточваць дэфіле, трэніраваць сінхроннасць рухаў, цягавітасць нам даводзілася на вельмі высокіх абцасах. Я заўсёды марыла паўдзельнічаць у конкурсе прыгажосці, верыла ў свой поспех. На шляху да гэтай мары мяне падтрымлівалі блізкія.

Апошні раз конкурс «Міс БДУ» праводзіўся пяць гадоў назад. Аднак арганізатары звярнулі ўвагу на вялікую цікавасць да мерапрыемства і паабяцалі арганізоўваць падобныя конкурсы часцей.

**Яўгенія ВІННІК,**
**Дар'я КОЎЗА**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# Сузор'е яркіх дуэтаў

Кожны летуценнік у дзяцінстве хацеў дацягнуцца да зорак, якія дораць нам сваё таямнічае святло. Сутыкнуцца з чароўнай атмасферай можна было і на шоу-конкурсе «Зорная пара». Да фіналу пары здолелі адчуць сябе сапраўднымі зоркамі: знялі ўласныя відэавізітоўкі (на тэму «7 прычын, чаму мы разам»), папазіравалі на фотасесіі на тэму «Стылі музыкі» і нават прынялі ўдзел у прэс-канферэнцыі. Не абышлося і без дабрачыннасці: кожная пара дапамагла арганізаваць у сваім інтэрнаце кірмаш у рамках акцыі «Годнае дзяцінства», сродкі ад якога будуць накіраваны ў Капыльскую дапаможную школу-інтэрнат.

Фінальны канцэрт адкрыў відэадзённік і агульны танец «зорных пар». За імі пачалося дэфіле. У першыя ж хвіліны вечара гледачы былі здзіўлены пышнымі ўборамі пар, якія зіхацелі і пераліваліся ў святле сафітаў. Удзельнікі былі гатовыя здзіўляць, а гледачы – падтрымліваць «свае» дуэты. Пасля гучных авацый пары адправіліся рыхтавацца да творчага конкурсу, а зала замерла ў чаканні.



*Конкурс арыгінальных касцюмаў*

Першымі выйшлі на сцэну «зоркі» дзясятага інтэрната – Сяленя Аляксей і Златагурская Любоў. Яны выступілі з танцам у стылі джаз-мадэрн, у якім распавялі эмацыйную гісторыю закаханай пары ў зваротнай храналогіі.

Усе дуэты паказалі цікавыя і кранальныя нумары, многія вырашылі выказаць свае эмоцыі і адносіны ў танцы. На сцэне з'яўляліся нявеста і жаніх, муж і жонка, салдат і яго верная дзяўчына, і нават насельнікі пакоя страху. Пара з 4-га інтэрната паказала светлавое шоу, якое «запаліла» ўсмешкі на тварах гледачоў. Мабыць, самым незвычайным шмат каму здаўся нумар пары з сёмага інтэрната: студэнты зрабілі гумарыстычную пастаноўку па матывах п'есы А. П. Чэхава, якая развесяліла ўсю залу дзякуючы хвацкаму акцёрскаму майстэрству і непасрэднасці канкурсантаў.

У конкурсе «Арыгінальны строй» ацэньвалася не толькі ўнікальнасць вобраза, але і тэхналогія стварэння строяў, якія былі зроблены з падручных матэрыялаў. Задумкі былі насамрэч цікавымі. Гледачы ўбачылі д'ябла і анёла, Спанч Боба разам з медузай, а таксама касманаўтаў, індзейцаў і інш.

І вось час апошняга конкурсу: дэфіле ў вобразах зорных пар. Самыя запамінальныя персанажы фільмаў, мультфільмаў, а таксама гістарычныя постаці з'явіліся на сцэне: Цэзар і Клеапатра, Барбі і Кен, сямейка Адамс, д'Артаньян і Канстанцыя.

І вось пачалася самая інтрыгавальная частка – узнагароджанне:

- трэцяе месца заняла пара з сёмага інтэрната – *Шчыпіла Мікалай і Паўлоўская Яна* атрымалі сертыфікаты на выраб партрэтаў у арт-студыі Fox and Rabit;

- другое месца ў *Мешчаракова Уладзіміра і Шыбекі Вольгі* з «чацвёркі», якія выйгралі вячэру ў рэстаране «Шынок у Лявона»;

- пераможцамі конкурсу абвешчаны ***Сяленя Аляксей і Златагурская Любоў*** з інтэрната № 10, якім падараваны акустычная сістэма, кухонны камбайн і сертыфікаты ў студыю прыгажосці LStudio.

Акрамя таго, пары з інтэрната № 11, якая перамагла ў намінацыі «Зорная пара анлайн» – *Майстрыкову Максіму і Федасенцы Паліне* (прагаласавалі больш за 6 тыс. чалавек) – у якасці адмысловага прыза ўручаны настольныя гульні ад інтэрнэт-крамы Nastolki.by.

Усе дзяўчаты атрымалі касметычныя наборы і цудоўныя букеты ад «Кветкавай крамы»!

«Зорная пара» – творчае і папулярнае мерапрыемства сярод студэнтаў, якое з часам становіцца ўсё лепшым. Дзякуючы гэтаму конкурсу кожныя два гады сярод нас запальваюцца новыя зоркі.

**Алеся ШАЛАЙ**

УНІВЕРСІТЭТ
**Выдаецца з 1929 года**

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

13 красавіка 2015 года
Падпісана да друку 8.04.2015 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***